отличие, например, от классических цивилизаций, где доминирующим является начало целостное, единое.

Следствием евразийского выбора веры для Руси-России становится и примат абсолютных ценностей Красоты, Добра и Истины, идея соборного бытия, ориентация на мир горний, а отсюда и невнимание к земному, материальному миру, аскетизм. Вспомним в данном контексте слова Иоанна Богослова, вещавшего: «Дети, не любите мира, ни того, что в мире», именно эти слова становятся духовной максимой православной Руси.

В целом, следует отметить географическую и историческую обусловленность евразийского характера русской цивилизационной модели. А потому споры, идущие вокруг извечного вопроса: «Что есть Россия – Восток или Запад?», по нашему мнению, имеют один ответ: «Россия есть ни Восток, ни Запад, Россия – это Евразия, абсолютно самостоятельная цивилизация и культура». В контексте этой цивилизационной сущность сложились определенные аксиологические доминанты, отличающие нашу культуру как от западной, так и от восточной культур.

Литература

1. Мир России - Евразия: Антология / Сост.: Л. И. Новиков, И. Н. Сиземская. - М., 1995.

2. Современные глобальные трансформации и проблема исторического самоопределения восточнославянских народов: моногр./ под ред. д-ра философ. наук, проф. Ч. С. Кирвеля. – Гродно, 2009.

3. Багдасарян, В. Э. Государство и ценности: российская модель / В. Э. Багдасарян // Российская государственность: исторические традиции и вызовы XXI века. - Великий Новгород. М., 2013.

4. Нарочницкая, Н.А. Россия и русские в мировой истории / Н. А. Нарочицкая. – М., 2003.

5. Синицина, Н. В. Третий Рим. Истоки и эволюция русской средневековой концепции. (XV – XVI вв.) / Н. В. Синицина. - М., 1998.

## ***Кедрык Т. В.*** **Аднаўленне замкаў Беларусі: сацыяльнае і культурнае вымярэнне**

Адным з прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і перадумова яе ўстойлівага развіцця

з'яўляецца ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Эфектыўнасць гэтай палітыкі забяспечвае заканадаўчая база ў галіне захавання гісторыка-культурнай спадчыны, якая пачала фарміравацца адразу пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі. "На сённяшні дзень яна ўключае 9 Указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», які ў 2006 г. быў прыняты ў новай рэдакцыі, 10 пастаноў Урада Беларусі, 14 пастаноў і загадаў Міністэрства культуры. Сямнаццаць іншых законаў утрымліваюць нормы, якія разглядаюць пытанні аховы спадчыны." [1]

Значым крокам у справе аховы гісторыка-культурнай спадчыны стала прынятае ў 2011 г. Дзяржаўнай праграмы "Замкі Беларусі" на 2012-2018 гг. Замкі вызначаюцца як будынкі ці комплексы будынкаў і збудаванняў, якія адносяцца да помнікаў абарончага дойлідства, археалогіі, гісторыі, спалучаюць культурныя традыцыіі будаўнічае майстэрства продкаў. Дзяржаўнай праграмай прадугледжана правядзенне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ, прыстасавання і экспанавання 38 аб'ектаў.

Усе аб'екты, задзенічаныя ў праграме, падзяляюцца на 4 катэгорыі. У першай катэгорыі вылучаюцца 7 помнікаў архітэктуры, якія найбольш захаваліся і дзе праводзяцца або плануюцца рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы і прыстасаванне да сучасных сацыяльна-культурных патрэб. Да другой катэгорыі адносяцца 7 аб'ектаў, якія захаваліся часткова, там праграма прадугледжваеправядзенне кансервацыі рэшткаў пабудоў у мэтах забеспячэння іх доўгатэрміновага захавання і экспанавання ў існуючым выглядзе. У трэцюю катэгорыю ўваходзяць рэшткі 19 былых збудаванняў, якія належаць да помнікаў археалогіі і захаваліся ў культурным пласце. Планавалася добраўпарадкаванне іх тэрыторый з выяўленнем месцазнаходжання замкавых пабудоў у сістэме планіроўкі. Да чацвёртай катэгорыі належыць 5 помніках археалогіі, дзе планавалася правесці работы па музеефікацыі [2].

Мэта праграмы была заяўлена як "стварэнне спрыяльных умоў для захавання, аднаўлення і рацыянальнага выкарыстання аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, развіцця ўнутранага і ўязнога турызму".

Мерапрыемствы праграмы павінны забяспечыць наступныя вынікі:

- адраджэнне і захаванне культурнай і духоўнай спадчыны Рэспублікі Беларусь;

- умацаванне прэстыжу краіны ў міжнароднай супольнасці;

- уключэнне гісторыка-культурных каштоўнасцяў, што належаць да абарончага дойлідства, у сферу сучаснага культурнага і эканамічнага жыцця;

- стварэнне дадатковых рабочых месцаў з улікам новага функцыянальнага прызначэння аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку праз стварэнне прывабнай прыдарожнай інфраструктуры турызму;

- пашырэнне разнастайнасці і геаграфіі турыстычных маршрутаў, што будзе спрыяць прытоку ў рэспубліку замежных турыстаў;

- значныя паступленні ў дзяржаўны бюджэт, у тым ліку валютные, найперш за кошт рэалізацыі турыстычных паслуг [2].

І мэта праграмы і вынікі, якія чакаюцца, палягаюць у сацыяльным і культурным вымярэнні, а праграма “Замкі Беларусі” не прадугледжвала нічога, акрамя ўласна праектных і будаўнічых мерапрыемстваў і па сутнасці ўяўляла сабой інвестыцыйны праект, у якім вызначаўся парадак выдзялення сродкаў на правядзенне рэстаўрацыйных работ і кансервацыйных мерапрыемстваў. Можна сказаць, што пералік работ, прадугледжаных праграмай не адпавядае яе мэце і чакаемым вынікам.

Кажучы пра рэстаўрацыю замкаў, неабходна ўдакладніць тры асноўныя планы іх функцыянавання як аб’ектаў спадчыны план рэстаўрацыі ці кансервацыі, які адносіцца да прафесійнай кампетэнцыі рэстаўратараў; кіравання сферай аховы і рэстаўрацыі гісторыка-культурнай спадчыны; сацыяльны план, які павінен змяшчаць любы сучасны рэстаўрацыйны праект.

Менавіта сацыяльны план існавання аб’ектаў гісторыка-культнай спадчыны становіцца цэнтральным. Зыходзячы з сучасных палажэнняў тэорыі архітэктурнай спадчыны, праяўленых у такіх міжнародных дакументах як Прынцыпы Валетта (2011) [3], Канвенцыя Фаро (2005) [4] і іншых, замкі могуць успрымацца ў якасці стрыжневых элементаў беларускага культурнага ландшафту ва ўсёй разнастайнасці яго матэрыяльных і нематэрыяльных праяўленняў. Замкі – ня ізаляваныя аб’екты спадчыны, яны абавязкова функцыянуюць у кантэксце бясконцай разнастайнасці

сацыяльных сувязяў – як у гістарычным разрэзе, так і ў гарызантальным сучасным плане.

Планаванне выключна парадку фінансавання не рэалізуе сапраўдных мэтаў рэстаўрацыі, якія ляжаць звычайна ўсацыяльнайі культурнайсферах. Праграма нефармулюеніякіх “ідэальных уяўленняў” аб мэтах ісацыяльным аспекце рэстаўрацыі. “Сацыяльныя эфекты” па сутнасці адсутнічаюць у частцы планавання ірэалізацыі, напэўна, мяркуецца, што яныcамісабой ўзнікнуць ў ходзе рэстаўрацыйных і кансервацыйных мерапрыемстваў.

Сацыяльнае і культурнае вымярэнне функцыянавання замкаў як аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны патрабуе стварэння мноства сацыяльных сувязяў, дзе сам замак з’яўляецца падставай для камунікацыі розных актараў. Асноўнымі актарамі, патэнцыйна зацікаўленымі ў захаванні і актуалізацыі замкаў з’яўляюцца: чыноўнікі, перш за ўсё мясцовага ўзроўню, бо большасць замкаў знаходзіцца на балансе раённых ці абласных выканаўчых камітэтаў; мясцовыя супольнасці, прадстаўленыя краязнаўцамі і “неабыякавымі” грамадзянамі; экстэрытарыяльныя эксперты – гісторыкі, рэстаўратары, спецыялісты па ахове спадчыны; прадстаўнікі бізнэсу. Працэсы рэнавацыі замкаў становяцца “штуршком”, які прыводзіць да актыўнага, часам не без канфліктнага ўзаемадзеяння названых актараў, якія маюцца свае задачы і мэты адносна функцыянавання замкаў.

Абгрунтаванне дзяржаўных інвестыцый у захаванне і аднаўленне знакавых гісторыка-культурных аб’ектаў даецца звычайна ў плоскасці сацыяльна-эканамічнага развіцця гарадоў і малых населеных пунктаў і замкі могуць разглядацца ў якасці эканамічнага рэсурсу (сродак прыцягнення і ўтрымання турыстаў, працоўныя месцы і г.д.). З іншага боку, аднаўленне замкаў дазваляе павысіць якасць і прэстыж жыцця ў населеным пункце, павялічыць разнастайнасць жыццёвых стратэгій, умацаваць або перазапісаць калектыўную ідэнтычнасць жыхароў, спрыяць утварэнню паўнавартасных супольнасцяў.

Асабліва гэта важна для маленькіх і да гэтага часу стагнуючых населеных пунктаў, дзе замак – гэта літаральна “горадаўтваральны” культурны аб’ект, які займае цэнтральнае месца ў структуры гарадской ідэнтычнасці.У гэтым сэнсе інвеставанне ў ключавыя

помнікі (замкі, манастыры, сядзібы) у малых гарадах, пасёлках і вёсках па сваёй эфектыўнасці можа знаходзіцца на адным узроўні з інвеставаннем ў агульнае добраўпарадкаванне, будаўніцтва “аграгарадкоў”.

У пэўнай сітуацыі замак сапраўды можа адыграць ролю “паравоза”у павышэнні якасці жыцця ў горадзе. Аднак для таго, каб гэта сапраўды адбылося, неабходна праектаваць не толькі архітэктурна-будаўнічую, але і сацыяльную частку рэстаўрацыі, якую ў дадзены момант беларускія рэстаўрацыйныя праекты ў сабе не ўтрымліваюць. Развіццё турыстычных прадпрыемстваў і самаарганізацыя жыхароў у Беларусі ўзнікаюць не столькі як запланаванае следства аднаўлення замкаў, колькі як стыхійны дзейнасць. І ў гэтым сэнсе значэнне рэальнай рэстаўрацыі кансервацыі замкаў некалькі абясцэньваецца.

Лакальныя супольнасці да гэтага часу практычна выключаны з удзелу ў лёсе замкаў. Многія аб’екты не належаць супольнасцям і нават мясцовым органам улады, праектныя рашэнні па ўсім ім прымаюцца і зацвярджаюцца ў буйных гарадах. У рэшце рэшт сталічныя тураператары прывозяць туды турыстаў для мімалётнага агляду славутасці, выключаючы мясцовыя гасцініцы і кафэ са свайго маршруту. Пры гэтым шэраг рэстаўрацыйных праектаў нават пагаршаюць сітуацыю, парываючы тыя нешматлікія сувязі мясцовых жыхароў з іх спадчынай, якіяіснавалі да гэтага часу, напрыклад, робячы тэрыторыю замкаў закрытай з платным уваходам.

Між тым, захаванне і аднаўленне матэрыяльнай формы не абавязкова прыводзіць да захавання культурнай каштоўнасці. Насаджаючы адну каштоўнасць, рэстаўратар можа знішчыць іншую, да гэтага часу непраяўленную. Падобныя рэстаўрацыйныя праекты далёка не ў поўнай меры адпавядаюць культурным і эканамічным інтарэсам мясцовых жыхароў. Для забеспячэння гэтых інтарэсаў мала рэканструкцыі рамантычных вобразаў. Крытычна важным тут уяўляецца пытанне аб функцыі аднаўлянага замка. Рэстаўрацыйныя дзеянні павінны не зьмяняць кардынальна функцыю аб’екта (са школьнага двара на музей), а хутчэй узбагачаць сцэнары яго выкарыстання. Музейная ж функцыя сакралізуе аб'ект, і такім чынам істотна скарачае гэтыя сцэнары.

Паколькі многія замкавыя населеныя пункты знаходзяцца ў перманентным сацыяльна-эканамічным крызісе, засваенне замкаў у іх магчыма толькі за кошт знешніх інтэлектуальных і культурных інвестыцый. Мясцовыя жыхары не ў сілах паўторна асвоіць пакінутыя калісьці аб’екты. У такіх умовах засваенне і падтрыманне класічных замкаў-музеяў сіламі мясцовых вельмі цяжка. Аднак знешняе ўздзеянне – гэта адначасова і шанец на захаванне матэрыяльнага складніка спадчыны, і разам з тым пагроза лакальнай культуры. Найбольш рацыянальным рэжымам культурнага складніка функцыянавання адноўленых аб’ектаў бачыцца не насаджэнне музейнага стандарту / канону, але падтрыманне і трансляцыя лакальнай памяці і ідэнтычнасці,якая захавалася.

Акрамя таго, асаблівая ўвага павінна надавацца вызначэнню асноўных карыстальнікаў адноўленага аб’екта. Замак, як нацыянальны здабытак, які належыць усяму беларускаму народу – гэта вельмі няўдалае вызначэнне карыстальніка. Карыстальнікі, гатовыя падзяліць адказнасць за лёс аб’екта – гэта заўсёды выразна акрэсленыя групы асоб. Рэстаўрацыя і кансервацыя цэркваў, касцёлаў і сінагог заўсёды больш паспяховая менавіта таму што гэтыя аб’екты належаць не “ўсім гараджанам”, але канкрэтнай канфесійнай ці нават этнічнай групе, і нават яшчэ вужэй – канкрэтнаму прыходу. Выяўленне і характарыстыка выразных груп карыстальнікаў аб’екта – адна з самых важных задач пры распрацоўцы канцэпцыі аднаўлення замкаў.

Такім чынам, найбольш эфектыўным магло б быць ператварэнне замкаў (замкавых тэрыторый) у своеасаблівыя грамадскія цэнтры. Сучасныя рэстаўрацыйныя праекты павінны прадугледжваць аднаўленне страчаных альбо ўсталяванне новых сувязяў паміж супольнасцю, культурным ландшафтам і гістарычным мінулым. Падобнага ўзроўню праектаванне зможа забяспечыць устойлівасць культурных аб’ектаў і цэлых ландшафтаў ў сярэдне-і доўгатэрміновай перспектыве.

Літаратура

1. Гісторыка-культурная спадчына Беларусі // Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь – 2015. – Рэжым доступа:

http://www.kultura.by/page/g-storyka-kulturnaya-spadchyna-belarus. – Дата доступа: 12.03.2016.

2. Дзяржаўная праграма “Замкі Беларусі” на 2012-2018 гады.– 2012. – Рэжым доступа: http://www.levonevski.net/pravo/norm2013/num06/d06230.html. – Дата доступа: 10.03.2016.

3. Принципы Валлетты по сохранению и управлению историческими городами и урбанизированнымитерриториями. – 2015. – Режим доступа: www.icomos.org/charters/RUSS_Valletta_principles.pdf. – Дата доступа: 01.03.2016.

4. Рамочная конвенция Совета Европы о важности культурного наследия для общества. – 2015. – Режим доступа:http://conventions.coe.int/treaty/rus/treaties/html/199.htm.– Дата доступа: 01.03.2016.

***Кендыш О. О., Левчук А. Л., Макаревич Т. И., Терлюкевич И. И.*** **Мифология и праздники в структуре народной культуры.**

Мифология народной культуры заключена в сказаниях, эпосах, легендах, сезонном восприятии природы. У белорусов эта особенность очевидна. Поскольку мифы часто воспринимаются как часть истории, то их современная модификация перешла в народные праздники. Мы рассмотрим один из них.

Купалье является общеславянским праздником, но белорусы – единственный народ Европы, который сохранил многовековой языческий уклад купальской ночи. Стремление познать тайны окружающего мира, наблюдение за природными явлениями формировали у наших предков соответствующие магические действия-таинства, обряды и традиции.

Купала – один из языческих богов восточных славян. Во времена славянского язычества он был особенно почитаем и причислялся к знатнейшим богам. Языческий Купала никогда не был Иваном, а приобрел это имя, когда праздник Купалы совпал с христианским праздником Рождества Иоанна Крестителя.

Наши предки считали, что пора буйного роста трав, созревания хлебов – самое время для разгула злых духов. В самые короткие